***Герман А. І.***

# БЕЛАРУСКАЯ РАДЗІННАЯ АБРАДНАСЦЬ: СПЕЦЫФІКА НЯСВІЖСКАГА РЭГІЁНА

***Навуковы кіраўнік: канд. філас. навук, ст. выкл. Клімовіч Г.І.***
*Кафедра філасофіі і паліталогіі*
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, г. Мінск*

**Актуальнасць.** Нягледзячы на пэўную даследаванасць цыклу радзіннай абраднасці на тэрыторыі Беларусі, некаторыя рэгіёны дагэтуль застаюцца лакунамі, якія чакаюць сваіх навукоўцаў. Сярод іх можна назваць і Нясвіжчыну. Носьбіты народнай традыцыі паступова зыходзяць з жыцця, зносячы каштоўныя веды. Вельмі важна стварыць пераемнасць пакаленняў, а для гэтага трэба даведацца як мага больш ад іх аб гісторыі развіцця традыцый, у тым ліку і радзіннай абраднасці на тэрыторыі Беларусі. Неабходнасць даследавання радзіннай абраднасці Нясвіжскага рэгіёна вынікае з адсутнасці навуковых распрацовак па дадзенай тэматыцы, а таксама з абавязку перад нашчадкамі захавання каштоўных ведаў, звязаных з бытам і традыцыямі нашых продкаў.

**Мэта:** выяўленне асаблівасцей і агульных рысаў у традыцыі радзіннай абраднасці Нясвіжскага рэгіёна ў канцы XIX - XX стст.

**Матэрыялы і метады.** Праведзены аналіз тэарэтычных крыніц, выкарыстаны метад інтэрвью з жыхарамі Нясвіжскага рэгіёна, выкарыстаны кампаратывісцкі падыход для параўнання спецыфікі абраднасці Нясвіжскага рэгіёну з абраднасцю Цэнтральнай Беларусі, праведзена абагульненне і сістэматызацыя атрыманай інфармацыі, на падставе чаго даследчыца прыйшла да вынікаў, падрабязна выкладзеных у рабоце.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Нараджэнне дзіцяці па сёняшні дзень з'яўляецца самай важнай з'явай у жыцці чалавека. Менавіта з дзяцей складаецца будучае ўсяго грамадства. Зараз дадзены працэс – гэта сфера, належная да афіцыйнай медыцыны, але зусім нядаўна яна ўваходзіла ў кола рытуалаў народнай традыцыі, была ў яе межах дастаткова распрацаванай, звязанай з вялікай колькасцю прыёмаў, прымхаў і забабонаў, адрознівалася строга рэгламентаваным парадкам.

Галоўную ролю тут адыгрывала бабка-павітуха, менавіта ад яе вопыту, практыкі і дзеянняў залежалі лёсы дзіцяці і парадзіхі. Вядома**,** што адсутнасць афіцыйнай медыцынскай практыкі прыводзіла да вялікай смяротнасці народжаных дзяцей і парадзіх, адзінай адказнай у межах вёскі за паспяховы працэс родаў была менавіта бабка-павітуха, таму ёй у радзіннай абраднасці належала галоўная роля. Нездарма яе шанавалі, паважалі і адорвалі рознымі падарункамі. На Нясвіжчыне такая павітуха лічылася бабушкай (няроднай) усіх дзяцей, якім яна дапамагла нарадзіцца.

Кожны перыяд разадіннай абраднасці мае свой звод правілаў і нормаў паводзін не толькі цяжарнай і парадзіхі, але і ўсіх, хто з ёю кантактуе. Яны выступалі сваеасаблівымі табу, парушэнні якіх было пагрозай для жыцця маці і дзіця. Некаторыя з іх магчыма патлумачыць і з пункту гледжання афіцыйнай медыцыны, яны маюць рацыянальнае зерне, іншыя з’яўляюцца адлюстраваннем уплыву міфілагічнага светапогляду.

У радзіннай абраднасці Нясвіжчыны магчыма вылучыць некалькі спецыфічных рыс. У перыяд уласна родаў, калі цяжарная не магла доўга радзіць, у сподачак налівалі і падпальвалі гарэлку, раздвігалі жанчыне ногі і ставілі гэты сподак у вобласці палавых органаў, каб грэла і спрыяла хутчэйшаму нараджэнню дзіцяці. Асаблівасці былі і ў купанні дзіцяці ў першыя дні жыцця. Перад тым, як купаць, у начоўкі трэба было дабавіць свянцоныя соль і ваду, што спряла ўзмацненню здароўя і аховы ад усяго ліхога. Таксама мае сваю спецыфіку абрад Хрэсьбінаў, а менавіта: выкарыстанне хустачкі з сухарыкамі, якая павінна была станоўча паўплываць на здароўе дзіцяці.

**Выснова.** На Нясвіжчыне сустракаецца шмат рысаў, характэрных для ўсёй Цэнтральнай Беларусі, аднак ёсць і свае асаблівасці, якія абмежаваны тэрытарыяльна і ўказваюць на індывідуальнасць Нясвіжскай зямлі.



репозиторий БГМУ